*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 10 (401) | Субота, 19 сакавіка 1960 года. | Цана 10 кап.

**Узнагароджанне ордэнамі і медалямі СССР жанчын перадавікоў прамысловасці і сельскай гаспадаркі, дзеячоў навукі і культуры, работнікаў партыйных, савецкіх, прафсаюзных, камсамольскіх і іншых арганізацый.**

У азнаменаванне 50-годдзя Міжнароднага жаночага дня і адзначаючы актыўны ўдзел жанчын Савецкага Саюза ў Камуністычным будаўніцтве і іх заслугі перад Савецкай дзяржавай па выхаванню маладога пакалення, за дасягненне высокіх паказчыкаў у працы і плённую грамадскую дзейнасць Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Указам ад 7 сакавіка 1960 года ўзнагародзіў:

**ОРДЭНАМ «ЗНАК ПАШАНЫ»**

**ЕРАСЬ** Алёну Паўлаўну—дацэнта кафедры педагогікі і логікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

**МЕДАЛЕМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ ДОБЛЕСЦЬ»**

**ЖЫДОВІЧ** Марыю Андрэеўну—дацэнта кафедры беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

# Па універсітэту

*Да 90-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна*

## Ленінскі вечар

*Учора ў клубе універсітэта адбыўся вечар, прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. З цікавым дакладам «Барацьба марксізма-ленінізма супраць сучаснай буржуазнай філасофіі і рэвізіянізма» выступіў дацэнт В. І. Сцяпанаў.*

*Ленінскія чытанні па праграме, зацверджанай парткомам, праходзяць такса ма на ўсіх факультэтах універсітэта.*

**В. ШЭІН.**

## Прыбывае абсталяванне

З Ленінграда, Масквы, Навасібірска, Казані, Растова-на-Дану прыбываюць у сталіцу нашай рэспублікі грузы, на якіх напісана: «Мінск, Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту».

Гэта прыбывае абсталяванне для многіх лабараторый універсітэта. У асаблівасці многа прыбораў паступіла на кафедру оптыкі, кафедру агульнай фізікі, кафедру фізікі цвёрдага цела, на некаторыя кафедры хімічнага і біялагічнага факультэта.

Сярод паступіўшых ва універсітэт прыбораў асцылограф «ДПС-13», інфрачырвоны вольтметр і многія іншыя складанейшыя прыборы.

Усяго з 1-га верасня 1959 года ва універсітэт паступіла вучэбнага і навукова-даследчага абсталявання на суму ў адзін мільён 600 тысяч рублёў, а з пачатку будаўніцтва новага вучэбнага корпуса — на 4,5 мільёны рублёў.

**С. СЦІПЛОВІЧ.**

## Новая прэм'ера

Вось ужо двойчы тэатральнны калектыў універсітэта паказаў гледачам сваю новую працу — п'есу А. Арбузава «Дванаццатая гадзіна». Бадай што, ва універсітэце даўно не было такой удалай пастаноўкі. Самадзейныя артысты гралі пад непарыўныя апладысменты студэнтаў. У поспеху калектыва вялікая роля належыць яго кіраўніку, рэжысёру пастаноўкі дацэнту С. Наваку.

Цяпер тэатральны калектыў рыхтуецца паказаць сваю новую пастаноўку на гарадскім аглядзе мастацкай самадзейнасці вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў сталіцы.

**М. БАНДАРЫН.**

## Цікавыя экспанаты

Калісьці белая чапля была шырока распаўсюджана па ўсёй тэрыторыі краіны. Прыгожае апярэнне зрабілася злейшым ворагам гэтай птушкі. Яно ж так аздоблівала дамскія шляпкі! І вось паляўнічыя амаль знішчылі белыя чаплі. Захаваліся яны толькі ў Астраханскім і Кызыл-Гачскім запаведніках. У канцы мінулага года Маскоўскі інстытут марфалогіі жывёл імя А. Н. Северцава арганізаваў у гэтыя запаведнікі экспедыцыю, якая вывучала экалага-фізіялагічныя асаблівасці птушак, жыццё якіх звязана з водным асяроддзем. У гэтай экспедыцыі ўдзельнічаў і студэнт біялагічнага факультэта нашага універсітэта Леанід Шкляроў.

Белая чапля вельмі асцярожная птушка, харчуецца толькі на адкрытых водных прасторах, не падпускае блізка да сябе чалавека. Выпадкова адну белую чаплю падстрэліў адзін з рабочых экспедыцыі. Ведаючы, што Шкляроў з'яўляецца страсным аматарам птушак, ён падараваў яе Леаніду.

Леанід прывёз нечаканы трафей ва універсітэт. Вядомы майстар сваёй справы Антон Ціток зрабіў з яго чучала, якое ўстаноўлена ў заалагічным музеі універсітэта. Акрамя таго Л. Шкляроў прывёз для музея двух вялікіх і двух малых бакланаў і некаторыя іншыя экспанаты.

**В. ДЫМОЎСКІ.**

ПІСЬМО У РЭДАКЦЫЮ

## „Культурная“ публіка

Нядаўна калектыў нашай мастацкай самадзейнасці запрасілі з канцэртам у Беларускі дзяржаўны універсітэт. Спадабалася нам гэтае запрашэнне. Праўда, артысты мы яшчэ не вельмі добрыя, але рыхтаваліся старанна. Нам сказалі, што ва універсітэце публіка культурная, і калі што ў нас не так добра атрымаецца, на нас не пакрыўдзяцца.

Прыехалі мы ў восем гадзін вечара. Нас сустрэлі ў нейкім пакоі, застаўленым спартыўным інвентаром. Так-сяк мы падрыхтаваліся, але тут высветлілася, што яшчэ толькі пачаўся даклад. Мы цярпліва чакалі сваёй чаргі. Нарэшце, праз дзве гадзіны пасля таго, як мы прыехалі, нам дазволілі выступіць.

Канцэрт пачаўся выступленнем хора, які выканаў некалькі песень савецкіх кампазітараў. Затым ішлі выступленні нашых спевакоў-салістаў, танцораў. Але пасля пятага нумару «культурная публіка» пачала тупаць нагамі, штосьці выкрыкваць, і, нарэшцэ, пачуўся чыйсьці голас: «Хопіць! Нам яшчэ патанцаваць трэба!» Наш саліст, які ў гэты час выконваў песню, разгубіўся і пакінуў сцэну. Нам было вельмі крыўдна за таварыша, але што мы маглі зрабіць.

Вырашылі мы паглядзець на тыя танцы, якіх так настойліва патрабавалі студэнты. Пад гукі нейкага завывання і барабаннага «бум-бум» у зале рухаўся натоўп. Некаторыя танцоры ледзь перастаўлялі ногі. А ў асобных позы былі такія, што нашы дзяўчаты засаромеліся. Вось цяпер мы зразумелі, чаму нашы прыгожыя рускія песні не змаглі крануць сэрцы гэтых юнакоў і дзяўчат. Нашы песні не былі «моднымі», таму і не пачулі мы апладысментаў.

Назад мы ехалі з дрэнным настроем, пакрыўджаныя. На жаль, дружбы са студэнтамі ў нас не атрымалася.

**А. КАЗЛОЎСКАЯ,**
**удзельніца заводскай мастацкай самадзейнасці.**
**(Газета «Автозаводец»)**

**АД РЭДАКЦЫІ: Пытанні, закранутыя ў пісьме Алёны Казлоўскай, здаюцца нам вельмі сур'ёзнымі. Як магло здарыцца, што студэнты пакрыўдзілі сваіх гасцей, рабочых аўтазавода? Як магло здарыцца, што купка стыляг, (так, купка, бо мы не верым, што яны выказвалі думку ўсіх прысутных) па сутнасці, сарвала канцэрт. Чаму прысутныя не прымусілі замаўчаць крыкуноў? Хіба ж да гэтага іх не абавязвалі камсамольскія значкі на грудзях і, нарэшце, звычайная чалавечая гасціннасць і элементарная ветлівасць. Нам здаецца, што грамадскія арганізацыі павінны зацікавіцца гэтым прыкрым здарэннем.**

# Галоўнае—запал і ініцыятыва

У доме партыйнай асветы адбыўся сход навуковага студэнцкага таварыства нашага універсітэта. На парадку дня стаяла справаздача Савета НСТ і выбары новага Савета.

Па першаму пытанню выступіў старшыня Савета НСТ аспірант У. Лазоўскі. Ён адзначыў, што ў рабоце навукова-даследчых гурткоў прымалі ўдзел звыш 1.100 студэнтаў, што складае больш адной трэцяй часткі студэнтаў універсітэта. У 1958—59 навучальным годзе былі прыняты ў члены НСТ 160 студэнтаў. У снежні 1958 года ва універсітэце была праведзена Юбілейная навуковая студэнцкая канферэнцыя, прысвечаная 40-годдзю БССР, на якой было заслухана 37 дакладаў. За арганізавана праведзеную канферэнцыю неабходна адзначыць біялагічны факультэт. Гэтага нельга сказаць аб філфаку і фізфаку.

З мэтай абмену вопытам арганізацыі навукова-даследчай работы некаторыя члены НСТ універсітэта выязджалі з навуковымі дакладамі на студэнцкія канферэнцыі ВНУ Масквы, Ленінграда, Адэсы, Харкава, Вільнюса, Рыгі. І. Старавойтаў (V курс філфака), В. Капціловіч (IV курс філфака), Г. Сяргеева (V курс гістфака), Цішкевіч (V курс фізфака) і іншыя былі ўзнагароджаны за свае даклады падарункамі і ганаровымі граматамі тых ВНУ, якія яны наведалі.

З 15 па 22 красавіка 1959 года была праведзена студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная рашэнням XXI з'езду КПСС і вынікам навуковай работы студэнтаў за 1958—1959 год. У рабоце канферэнцыі прымалі ўдзел студэнты з МДУ, Ленінградскага, Кіеўскага, Вільнюскага, Адэскага, Львоўскага універсітэтаў. 115 лепшых работ былі рэкамендаваны на гарадскі агляд.

Лепшыя студэнцкія навуковыя работы прадстаўлены на Усесаюзны конкурс. Гэта работы студэнтаў Налівайкі (IV курс гістфака), Круглік (V курс фізфака), Маліноўскай, Ляшковай і Пашкевіч (V курс гістфака).

Трэба адзначыць добрую пастаноўку навукова-даследчай работы на гістфаку, за якую адказваў студэнт IV курса Фелікс Налівайка, на біяфаку (старшыня факультэцкага савета СНТ Леанід Шкляроў). Значна палепшылася ў другім паўгоддзі мінулага навучальнага года работа даследчых гурткоў на філфаку.

Побач з гэтым ёсць яшчэ рад сур'ёзных недахопаў у навукова-даследчай рабоце. Многія члены гурткоў не вядуць самастойнай работы, а толькі лічацца ў спісах членаў СНТ.

Члены Таварыства амаль не выступаюць з дакладамі перад моладдзю прадпрыемстваў, заводаў, школ, калгасаў. А як бы гэта ажывіла нашу лекцыйную прапаганду!

У спрэчках адзначался, што не выдаюцца студэнцкія навуковыя работы, што выкладчыкі недастаткова ўдзяляюць увагі навуковай рабоце. Карысна было б арганізаваць выстаўкі лепшых студэнцкіх работ.

На сход былі запрошаны студэнты з іншых ВНУ Мінска. З цікавай прамовай выступіў намеснік старшыні Савета студэнцкага навуковага таварыства Беларускага палітэхнічнага інстытута т. Філіпаў. У НСТ БПІ налічваецца каля паўтара тысяч студэнтаў. Для прапаганды навукова-тэхнічных дасягненняў створана лектарская група. У БПІ працуе 5 студэнцкіх канструктарскіх бюро. Таварыш Філіпаў запрасіў прадстаўнікоў універсітэта прыняць удзел у XV канферэнцыі БПІ, якая адбудзецца з 29 сакавіка па 8 красавіка.

Прарэктар універсітэта па навуковай частцы Г. А. Павецьеў падкрэсліў, што ў рабоце некаторых гурткоў яшчэ не хапае належнай ініцыятывы. Запал і ініцыятыва—вось галоўнае ў навуковай рабоце. Студэнцкія навуковыя работы адасоблены ад тэматыкі навуковых работнікаў універсітэта. А сумесная праца прынесла б карысць і студэнтам, і навуковым работнікам. У новым корпусе будзе створан рад праблемных лабараторый, але для іх укамплектавання няма яшчэ кадраў. Гэта адкрывае шырокія магчымасці для студэнтаў. Рэктарат згодзен надрукаваць работы першай катэгорыі, калі яны будуць падрыхтаваны студэнтамі да друку. Далей т. Павецьеў зачытвае загад рэктара нашага універсітэта прафесара Сеўчанкі аб выніках гарадскога агляду навуковых студэнцкіх работ. Па выніках агляду да першай катэгорыі было аднесена 31 работа, да другой—43, да трэцяй—26 работ. Адхілена восем работ. У мэтах заахвочвання навуковай работы студэнтаў рэктар загадвае лепшым гуртkoўцам аб'явіць падзяку і выдаць каштоўныя падарункі.

Сход абраў новы Савет навуковага студэнцкага таварыства універсітэта ў складзе 11 чалавек.

**Л. АКАЛОВІЧ.**

## СНТоўцы пакуюць чамаданы

Адбылося чарговае пасяджэнне Савета СНТ універсітэта. На ім было разгледжана пытанне аб удзеле студэнтаў універсітэта ў рабоце навуковых канферэнцый іншых ВНУ краіны. Было вырашана, што прадстаўнікі універсітэта выступяць з дакладамі на навуковых канферэнцыях Вільнюскага, Адэскага універсітэтаў і многіх іншых ВНУ Саюза.

